# Мода на чытанне не знікае



Амаль палова жыхароў нашай краіны па статыстыцы з'яўляецца карыстальнікамі кніжніц, у выніку на 2,4 тысячы чалавек прыходзіцца адна публічная бібліятэка. А значыць, Дзень бібліятэк — не толькі прафесійнае свята работнікаў бібліятэчнай сферы, але і важны дзень для ўсіх аматараў чытання.

Штогод 15 верасня ў Беларусі адзначаецца Дзень бібліятэк — свята, устаноўленае ўказам Прэзідэнта ў 2001 годзе па ініцыятыве Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі.

Дата свята, дарэчы, была выбрана невыпадкова. 15 верасня 1922 года ў Мінску заснавалі Беларускую дзяржаўную і ўніверсітэцкую кніжніцу, вядомую ў савецкія часы як бібліятэка імя У. І. Леніна («Ленінка»), цяпер гэта Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Таксама Дзень бібліятэк адзначаюць у Расіі і Кыргызстане, але там дата свята іншая — 27 мая.

У Дзень бібліятэк традыцыйна праводзіцца шмат імпрэз, асноўная мэта якіх — павышэнне грамадскага статусу і прэстыжу кніжніц як інфармацыйных і культурна-адукацыйных цэнтраў. Ладзяцца круглыя сталы, выстаўкі, прэзентацыі.

Адным словам, бібліятэка цяпер — не толькі месца, дзе можна знайсці патрэбнае выданне, але і своеасаблівы клуб па інтарэсах як для дарослых, так і юных чытачоў. І калі яшчэ некалькі гадоў таму многія сцвярджалі, што з прыходам гаджэтаў кніжніцы будуць не вельмі запатрабаваныя, то сёння мы бачым іншае: мода на кнігі не знікае, а наадварот, інтарэс да друкаванага слова расце. Бо нічым не заменіш асалоду ад чытання, знаёмства з цікавай кнігай.

**Раіса МАРЧУК**